ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
__________У.У. Рыжкоў
«10» чэрвеня 2014г.

# ТЭКСТ
## дыктанта з дадатковым заданнем па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме ў ліцэй

Дата правядзення – 16 чэрвеня
Час выканання – 45 хв.

Што такое час? Гэта нішто: яго нельга ўбачыць, пачуць, памацаць, панюхаць, паспрабаваць на язык; ім нельга заткнуць дзірку ў страсе або ў бюджэце; яго нельга запрэгчы ў плуг, запрасіць на шклянку гарбаты.

Час – гэта нешта бясконца бясчулае і бессароннняе: якія ні адбываліся б акты найвышэйшай гуманнасці ці нечуванага здзеку з асобы чалавека, ён застаецца спакойным.

Час – гэта нешта нечувана шпарка-імклівае. У той жа час нешта нерухомае і нязменнае.

Нягледзячы, аднак, на сваю нерухомасць і безудзельнасць, якую разнастайную афарбоўку прымае час у розных людзей і як па-рознаму скарыстоўваюць час гэтыя розныя людзі! Адзін у свой час быў вялікім чалавекам, а ў нашы часы нічога не варты. Другі стаў бы вялікім чалавекам, але ён не мае часу носа ўцерці за работаю, а трэці ные ад таго, што не ведае, куды яму дзець лішні час (132 сл.).

***Дадатковае заданне***

| **1 варыянт** | **2 варыянт** |
|---|---|
| ***1. Вызначце*** | |
| тып тэксту | стыль тэксту |
| ***2. Выпішыце з першага сказа трэцяга абзаца адно слова, напісанне якога*** | |
| адпавядае вымаўленню | не адпавядае вымаўленню |
| ***3. Пабудуйце гарызантальную схему*** | ***Пабудуйце вертыкальную схему*** |
| апошняга сказа ў тэксце | сказа другога абзаца |
| ***4. Перакладзіце словазлучэнне на рускую мову*** | |
| шклянка гарбаты | нечувалага здеку |